# “ТАЯМНІЦЫ ПОЛАЦКАЙ ГІСТОРЫІ” У. АРЛОВА ЯК ПРЫКЛАД МАСТАЦКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ПРОЗЫ

*В.Ф. Падстаўленка, Н.М. Налётава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Сярод разнастайных форм мастацкай папулярызацыі фактаў мінулага асаблівую прыярытэтнасць набылі ў беларускай літаратуры аўтарскія мадыфікацыі гістарычнага нарысу: “Імя ў летапісе” Вітаўта Чаропкі, “Памяць пра легенды” Кастуся Тарасава,“Еўфрасіння Полацкая” і “Таямніцы Полацкай гісторыі” Уладзіміра Арлова, інш.

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена недастатковай вывучанасцю мастацка-дакументальнай прозы У. Арлова.

Мэта дадзенага даследавання – выявіць стылявыя і жанравыя адметнасці кнігі “Таямніцы Полацкай гісторыі” названага пісьменніка.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання абрана мастацка-дакументальная кніга “Таямніцы Полацкай гісторыі” (1994) У. Арлова. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэстрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як вядома, мастацка-дакументальная літаратура ўключае творы розных відаў і жанраў, але ўсе яны заснаваны на дакументальных падзеях, рэальных з’явах, жыцці сапраўдных, канкрэтных людзей. Як слушна заўважае А.М. Дарагакупец, “сувязь гістарычнай прозы з дакументам, імкненне да дакументальнасці дазваляюць асобна выдзеліць як яе разнавіднасць наступныя жанрава-стылёвыя формы дакументальна-мастацкай літаратуры: нарысы, у якіх “белетрызуецца гісторыя”; літаратурныя біяграфіі выдатных у нацыянальнай гісторыі асоб; “калектыўныя” дакументальна-мастацкія рэпартажы з мінулага” [1, 10]. Агульнасцю такіх твораў стала спалучэнне дакументальнасці з фрагментарным аўтарскім вымыслам. Гэта па жанравых імператывах было першапачаткова недапушчальна, аднак паступова сітуацыя змянілася, і да дакументалістыкі дадаліся значныя элементы аўтарскай фантазіі і індывідуальнай верыфікацыі падзей.

У кнізе “Таямніцы Полацкай гісторыі” аўтар на аснове архіўных дакументаў (пратаколаў, сялянскіх скарг, ведамасцей, актаў, грамат, заключэнняў экспертызы і інш.) у мастацкіх вобразах і ідэйна значных карцінах дае праўдзівае адлюстраванне гісторыі Полаччыны з часоў паганства да пачатку XX стагоддзя.

Пісьменнік апелюе да краязнаўчых, археалагічных, гістарычных даследаванняў Аляксея Сапунова, Міхася Ткачова, Міколы Ермаловіча, Сяргея Тарасава і інш. Так, абапіраючыся на тэзу археолага С. Тарасава, што ў старажытныя часы вакол Валовага возера існаваў цэлы комплекс паганскіх капішчаў, У. Арлоў звязвае ўзнікненне гэтай назвы з ахвярапрынашэннем валоў у гонар бога Перуна.

Для аргументацыі сваіх думак пісьменнік уводзіць цытаты з такіх літаратурных і мастацка-дакументальных твораў, як “Аповесць мінулых гадоў”, “Слова пра паход Ігаравы”, “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, “Сага пра Эймунда”, “Аповесць пра Варлама і Іосіфа”, “Хроніка Быхаўца”.

Вельмі часта Арлоў прэзентуе свае версіі гістарычных падзей.Так, аўтар праводзіць своеасаблівае расследаванне і вывучае акалічнасці заўчаснай смерці князёў Ізяслава і Усяслава. Гэта звязана, паводле меркаванняў даследчыка, з імкненнем Уладзіміра не дапусціць узмацнення і адраджэння некалі велічнага Полацкага княства: “Даты ствараюць загадкавы ланцужок: 1000 год – памірае Рагнеда, 1001 – Ізяслаў, 1003 – Усяслаў Ізяславіч. Сын і ўнук развітваюцца з жыццём значна раней за бацьку з дзедам, што дажыве да 1015 года. Відаць, доўгія рукі меў Уладзімір Краснае Сонейка, вялікі быў ягоны страх перад адраджэннем Полацка” [2, 38]. Як бачна, тут старажытная фактуальнасць сінтэзуецца са спробамі псіхалагічна раскрыць матывацыю ўчынкаў гістарычных асоб.

Змест аналізуемай кнігі насычаны рытарычнымі пытаннямі, напрыклад: “Ці шмат хто з нас, сённяшніх палачанаў, нашчадкаў крывічоў, распавядзе свой род няхай не да пятага, а хоць бы да трэцяга пакалення?” [2, 74]. З разваг пісьменніка чытач можа даведацца пра адносіны савецкай улады да беларускага народа і яго велічных асоб: “Бальшавікам не падабалася сацыяльнае паходжанне ўнучкі Усяслава Чарадзея. Не падабалася яе асветніцтва, што пярэчыла міфу пра адвечную забітасць беларусаў, якія да так званага “Вялікага Кастрычніка” і “лямпачкі Ільіча” мусілі быць спрэс галодныя і непісьменныя” [2, 117].



Репозиторий ВГУ

Мастацкай вобразнасцю вылучаецца раздзел “Пад уладаю Перуна і Сварога”, у якім аўтар прыводзіць цікавыя міфалагічныя, этнаграфічныя звесткі. У цэнтры ўвагі У. Арлова – язычніцкі пантэон (Сварог, Пярун, Дажбог, Ярыла, Вялес, Зюзя, Каляда, Хорс, Купала, Лада, Жыжаль, Любіч, Цёця, Тур, Жыцень, Мокаш і інш.), абрады, звычаі, святы (камаедзіца, Каляды, Купалле), народныя песні і павер’і нашых продкаў. Асабліва запамінальнымі ў кнізе з’яўляюцца персаніфікаваныя апісанні багоў: “Пярун – волат з сівымі або вогненна-рудымі кучарамі і барадой, які трымае ў руцэ лук і стрэлы-маланкі. Час Перуновае ўлады доўжыўся ад першай да апошняй навальніцы, а потым бог спаў да будучай вясны. Ярыла – гожы юнак у белым уборы. Ён ездзіў на белым кані па нівах, аглядаў ярыну, спрыяў ураджаю…” [2, 11].

Асаблівай мастацкасцю і вобразнасцю вылучаюцца раздзелы, прысвечаныя жыццёваму шляху і дзейнасці Усяслава Полацкага (“Час Чарадзея”), Еўфрасінні Полацкай (“Нібы прамень сонечны”), князя Валодшы (“Хто атруціў князя Валодшу”), Францыска Скарыны (“У гасподзе падуанскай”), Сімяона Полацкага (“Муж дабраверны, царкве і дзяржаве патрэбны”). Думаецца, гэта звязана з імкненнем пісьменніка як мага больш зацікавіць чытача, звярнуць увагу на славутых людзей Полаччыны, вядомымі за межамі нашай Бацькаўшчыны.

У згаданых творах характар герояў удала раскрываецца праз дыялогі, унутраныя маналогі, гіпатэтычна магчымую “плынь свядомасці” пратаганістаў. Напрыклад, патрыятызм першага ўсходнеславянскага кнігадрукара, асветніка, гуманіста Францыска Скарыны выяўляецца праз апісанні яго ўспамінаў пра Полаччыну: “Перад вачыма паплылі малюнкі маленства: двор на Верхнім замку, бераг Палаты, адкуль у летнюю спёку так цудоўна даць нырца ў чыстую халаднаватую ваду, паездкі ў бацькаў маёнтак Тройдавічы, навучанне ў полацкіх манахаўбернардзінаў” [2, 175]. Як бачна з тэксту, надалей, знаходзячыся ў Італіі, асветнік таксама найперш думае пра выпрабаванні, якія наканаваны яго Радзіме, і пра “духоўнае здароўе народа” [2, 179].

Унутраныя маналогі і дыялогі адыгрываюць важную ролю ў раскрыцці характару асветніцы, гуманісткі, мецэнаткі, першай ігуменні на ўсходнеславянскіх землях Еўфрасінні Полацкай. Вось адзін з іх: “Што ж паспелі роды нашыя, якія былі да нас? Жаніліся і выходзілі замуж, і княжылі, але не вечна жылі; жыццё іх праплыло, і загінула слава іхняя, быццам прах, горай за павуцінне. Затое жанчыны, што… мячом духоўным адсеклі плоцкія асалоды – тых памятаюць на зямлі” [2, 73]. Такія элементы мастацкага псіхалагізму, кажучы метафарычна, дазваляюць “ачалавечыць” манументальны вобраз, зрабіць яго больш кранальным і рэалістычна сапраўдным, дапамагаюць зпраектаваць гістарычныя варункі на сучаснае жыццё.

**Заключэнне.** На прыкладзе кнігі “Таямніцы Полацкай гісторыі” яскрава бачна, як у асобе Уладзіміра Арлова сінтэзуюцца гісторык і пісьменнік. Як гісторык, ён імкнецца да дакументальнасці, аб’ектыўнасці ў выкладзе падзей, а як пісьменнік – да вобразнасці і псіхалагічнай насычанасці велічных постацей мінулага. Спалучэнне гэтых дзвюх рыс прыводзіць да арыгінальнай формы мастацка-дакументальнай прозы.


Спіс літаратуры

1. Дарагакупец, А.М. Тэндэнцыі рамантызацыі і інтэлектуалізацыі ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.01.01 / А.М. Дарагакупец; БДУ. – Мінск, 2005. – 20 с.
2. Арлоў, У.А. Таямніцы Полацкай гісторыі / У.А. Арлоў. – Мінск: Беларусь, 1994. – 463 с.


## ГАСЦІННАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ: АБ’ЕКТЫВАЦЫЯ Ў МОВЕ І ТЭКСЦЕ


*К.С. Півавар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Сярод актуальных накірункаў мовазнаўства вылучаюцца даследаванні ўзаемасувязі мовы і мыслення, мовы і культуры, што абумоўлена антрапацэнтрычнай накіраванасцю сучаснай лінгвістыкі.

Мэтай нашага артыкула з’яўляецца выяўленне сродкаў адлюстравання ў беларускай мове адной з самых тыповых рыс беларускай ментальнасці – гасціннасці.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі дадзеныя лексікаграфічных крыніц і мова твораў хрэстаматыйнай літаратуры і публіцыстыкі. У працы выкарыстаны метады этымалагічнага, кампанентнага і кантэкстуальнага аналізу.



Репозиторий ВГУ